# ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

*УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»*
*г. Минск, Республика Беларусь.*
*Паномова Т.А..*

*Парфенков В.Я. –к.и.н. доцент*

Полацкая князеўна, ігумення, беларуская святая.

Нарадзілася Е.Полацкая каля 1101 г. у Полацку. Яна паходзіла з роду полацкіх князеў.

Прадслава была вельмі здольнай дзяўчынай, мела вялікую ахвоту да вучэння. Яе настаўнікамі былі духоўныя асобы, вучылася пераважна на рэлігійных кнігах. Чуткі  пра прыгожую і адукаваную дзяўчыну разнесался далека за межамі Полацка і да яе зачасцілі сваты. Аднак дзяўчына адмовілася ад дынастычнага шлюбу і, насуперак волі бацькоў, пастрыглася ў манашкі, пад іменем Ефрасінні. З гэтага моманту яна аддае ўсе свае жыцце служэнню Богу і свайму народу. Жыла яна ў келлі Сафійскага сабора ў Полацку.

Стаўшы манашкай яна не хавалася за манастырскімі сценамі. Наадварот прымала актыўны ўдзел у свецкім жыцці грамадства. Па-першае яна разгарнула шматгранную асветніцкую дзейнасць. Займалася перапісваннем кніг, у першую чаргу царкоўных, якія паапўнялі бібліятэкі манастыроў, цэркваў, прыватных уласнікаў. Прадслава збірала вакол сябе таленты, займалася мецэнацтвам, садзейнічала ў пабудове цэркваў, манастыроў. У канцы 1120 г. яна заснавала пад Полацкам жаночы манастыр Святога Спаса (стаў называцца Спаса-Ефрасіннеўскім). У канцы 1150 г. Ефрасіння заснавала мужчынскі манастыр з царквой Святой Багародіцы, дзеля якой набыла і падаравала образ Багародзіцы Эффеской.

Да прывезеных святынь па просьбе Ефрасінні ювелір Лазар Богша зрабіў крыж для царквы Святога Спаса. Крыж стаў нацыянальнай рэліквіяй беларусаў. Шануемая праваслаўнымі, каталікамі і ўніятамі. У гады Вялікай Айчыннай вайны крыж знік. Цяпер зроблена копія крыжа, якая захоўваецца ў Полацку ў Сафійскім саборы.

Заснаваныя Ефрасінняй цэрквы, манастыры сталі асяродкамі асветы на полацкай зямлі. На пачатку 1167 г. Ефрасіння паехала па святых мясцінах, наведала Іерусалім, з вялікай пашанай была прынята візантыйскім імператарам, шматлікімі царкоўнымі асобамі. У час наведвання святых мясцін Ефрасіння захварэла. Памерла 23 альбо 25 мая 1167 г. Пахавалі яе ў манастыры Святога Феадосія, непадалеку ад Іерусаліма. У 1187 г. перапахавалі ў Кіева-Пячэрскай лаўры – на той час гэта было самае святое месца ва ўсходнеславянскіх землях. У 1910 г. астанкі асветніцы даставілі ў заснаваны ей Спаскі манастыр у Полацку, дзе яны знаходзяцца і сення. Ефрасіння стала першай жанчынай кананізаванай Рускай праваслаўнай царквой у лік святой. Святой яна прызнана і каталіцкай царквой.

Спіс літаратуры:

1. Арлоў У.А. Ефрасіння Полацкая. Мінск, 1992.
2. Гісторыя Беларусі ў 2 частках. Ч.1. Мн., 2007, с.66-67.